Друкуецца ў «Маладосці»

ВЫРАТАВАЛЬНАЯ МІСІЯ

Сяргей БЕЛАЯР

УРЫВАК З АПОВЕСЦІ

Высокаарганізаваныя іншапланетныя формы жыцця не могуць нападаць без прычыны: у гэтым няма ніякай логікі! Нарэшце гэта заяўлена нашымі фантастамі — у супрацьвагу поглядам замежных мэтраў жанру. Паміж мыслячымі стварэннямі не можа быць бездані, гэта так. Але ж канфлікт цывілізацый заўсёды патрабуе ахвяр... Гэтая місія закончылася тым, што... Не, лепш не раскрываць вам раней часу тое, чым дакладна яна закончылася. Сяргей Белаяр кожнай старонкай трымае чытача ў напружанні і не дае забыцца, што на касмічнай станцыі «Ёган Кеплер»... шмат пылу.

Фатонны зоркалёт «Слейпнір» імкліва набліжаўся да канчатковага пункту маршруту — міжнароднай касмічнай станцыі «Ёган Кеплер».

— Як думаеш, чаму знікла сувязь са станцыяй? — спытаў Кінбут Бянткоўскі, гледзячы ў манітор, на якім, вылучаючыся на фоне вугальна-чорнай прасторы з сотнямі немігатлівых зорак, расла Asteroidea.

— Не ведаю, камандзір, — пацісну плячыма Едка Гедройц, — прычын можа быць шмат, пачынаючы ад паломкі перадатчыка і заканчваючы сонечнай бурай. Чаго гадаць? Састыкуемся і ўсё высветлім!

Бянткоўскі кіўнуў. Зямля атрымала сігнал SOS тыдзень таму, пасля чаго экіпаж МКС на сувязь больш не выходзіў.

— Будзем спадзявацца, што нічога сур'ёзнага не адбылося.

— Гэта апошняе, у што б я паверыў. Рацыянальней зыходзіць з таго, што ў іх — праблемы! Прычым сур'ёзныя.

— Ты ператвараешся ў закаранелага цыніка, Едка!

— Космас робіць мяне такім. Пройдзе яшчэ не адна тысяча, калі не мільён гадоў, перш чым зоркі перастануць быць варожымі людзям. Заўсёды трэба настройвацца на горшае.

«Ёган Кеплер» паступова запаўняў сабой увесь экран.

— Бачных пашкоджанняў не адзначаю, — паведаміў Доўкгал Геліч, скарыстаўшыся трансфакатарам. — Зваротны бок разгледзець не магу!

— Як толькі скінем хуткасць да самай малой, высылай бот.

— Ёсць высылаць бот пасля тармажэння!

— Пераходжу на тармажэнне, — папярэдзіў таварышаў Скумін Разыцень. «Слейпнір» слаба скалануўся. Слупок акселераметра хутка папоўз уніз, паказваючы адмоўнае паскарэнне.

Праз некалькі хвілін, калі да станцыі заставалася пяцьсот кіламетраў, інжынер-радыст выпусціў бот, карэктуючы яго курс пры дапамозе джойсціка. Разведчык не баяўся ні паскарэння, ні рэзкага змянення курсу, ні звышвысокіх і звышнізкіх тэмператур, што дазваляла выкарыстоўваць яго ў шырокім дыяпазоне даследаванняў.

Астранаўты не адрывалі позіркаў ад маніторaў. Напружанне расло.

— Выява выразная! Адхіленні тэхнагеннага характару адсутнічаюць!.. Што за чорт?

— Што здарылася, Доўкгал?

— Я страціў кантроль над ботам! — Геліч рухаў джойсцікам, аднак нічога не мянялася: разведчык куляй нёсся да станцыі. Усачыць за сапраўдным вадаспадам даных не ўяўлялася магчымым.

Праз імгненне камера бота адключылася.

Інжынер-радыст вылаяўся і паспрабаваў аднавіць кантроль. Нічога не атрымалася — разведчык урэзаўся ў адну з сонечных батарэй. Яна выбухнула мільёнам аскепкаў і дробных абломкаў. Куляючыся, бот пачаў адыходзіць ад МКС.

— Што гэта было?

— Не ведаю, капітан! Бот быў спраўны — я двойчы пратэсціраваў усе сістэмы... — У голасе інжынера-радыста гучалі ноткі разгубленасці. — Сувязь нібы абсеклі...

Бянткоўскі і Гедройц пераглянуліся. На твары работніка службы бяспекі з'явіўся выраз «я ж казаў!».

— Адмовіла і асноўная, і дублюючая сістэмы. У маёй практыцы такое ўпершыню!.. Паспрабуем другі бот?

Бянткоўскі думаў нядоўга:

— Толькі асцярожна!

— Ёсць асцярожна! — Словы Геліча не разышліся са справай: ён акуратна падвёў бот да меркаванай мяжы мёртвай зоны, гатовы ў любы момант вярнуць разведчыка. Апаратура нічога не рэгістравала. Нервова аблізаўшы вусны, інжынер-радыст плаўна штурхнуў джойсцік.

Бот перасёк нябачную рысу і працягваў рух. Геліч падвёў разведчыка ўшчыльную да «Ёгана Кеплера», што дазволіла разгледзець паверхню МКС у дробных дэталях, пасля чаго накіраваў на іншы бок.

— Герметычнасць корпуса не парушаная!.. Ніякіх слядоў экстраннай эвакуацыі!

— Паспрабуй звязацца з імі!

— Ёсць!.. Выратавальнае судна «Слейпнір» выклікае міжнародную касмічную станцыю «Ёган Кеплер»!.. «Ёган Кеплер», адкажыце «Слейпніру»!.. — Інжынер-радыст перабраў шэраг частот, але на кожнай з іх адказам быў толькі белы шум.

— Доўкгал, вяртай бот!.. Экіпажу падрыхтавацца да стыкоўкі!.. — Астранаўты заварушыліся ў крэслах, правяраючы прывязныя рамяні і ўладкоўваючыся ямчэй. Пераканаўшыся ў тым, што ўсе гатовыя, капітан загадаў: — Скумін, пачынай!

Працэдура заняла каля паўгадзіны — «Слейпнір» зблізіўся са станцыяй і выпусціў злучальныя аўтаматычныя фермы, увянчаныя магутнымі магнітнымі прысоскамі. Дакрануўшыся да спецыяльных прыёмных пляцовак, яны намёртва зафіксавалі зоркалёт. Для ўзлёту патрабавалася адключыць электрычны ток, які сілкаваў магніты.

— Едка, бяры Геліча, Валовіча і Хурду!

— Зразумеў, камандзір!.. За мной!

Астранаўты апранулі скафандры, праверылі сістэму жыццезабеспячэння, рыштунак і зброю. На адмысловую самаходную каляску было загружана ўсё неабходнае для правядзення выратавальнай аперацыі.

— З Богам! — сказаў Бянткоўскі і праводзіў падначаленых вачыма да таго моманту, пакуль за групай не зачыніліся створкі шлюзавой камеры, затым зноў вярнуўся да экрана.

— Камандзір, як сувязь?

— Чую і бачу цябе добра, Едка!

— Уваходзім!

***

У корпусе прыйшлося выразаць дзірку — дзверы аказаліся заблакіраванымі. Прычым механічна — у крэмальерны замок быў устаўлены лом. Астранаўты ўключылі ліхтары на вінтоўках — святло не гарэла. Прамяні заскакалі па падлозе, сценах і столі.

— Яны нібы спрабавалі ад чагосьці абараніцца! — Гедройц, пакруціўшы ў руках лом, адкінуў яго, падняўшы воблака пылу, які на здзіўленне хутка асядаў.

— Дзіўна! Прайшоў усяго тыдзень, а пылу столькі, як пасля некалькіх тысяч гадоў запусцення...

Калі ўжо варта варажыць на будучыню, як некалі, па радочках кніг, то лепш за ўсё, калі гэта будуць кнігі брэсцкай пісьменніцы Кацярыны Мядзведзевай, у якой ледзь не кожная старонка змяшчае запавет, назіранне, параду, падказку або падбадзёрванне. Яе казкі — гэта, вядома ж, казкі. Але прыдатныя для чытання дарослымі. Вельмі-вельмі прыдатныя.
Тут прапануецца толькі пачатак аповесці, інтрыга якой — інтрыга «наадварот» — у тым, што гераіня да апошняй старонкі не ведае таго, пра што чытач здагадаўся, прачытаўшы загаловак.

ЧАРАЎНІК ДЛЯ ДЭЙСІ МЭЙ

Кацярына МЯДЗВЕДЗЕВА

УРЫВАК З АПОВЕСЦІ

Калі ў маіх сясцёр у дзяцінстве пыталіся, што яны любяць, Эма адказвала, што любіць маму і тату, Аліса згадвала слівавы ўзвар і прафітролі з персікавым джэмам, а я заўсёды маўчала. Таму што я люблю быць. Проста быць. Быць дома. Ці быць у садзе. Быць ля вады. Глядзець на дрэвы і траву, адчуваць скурай, як пячэ сонца ці мароз. Слухаць, як стукаціць паціху дожджык. Вязаць. Чытаць. Думаць што-небудзь прыемнае. Марыць. Калі няма ні сяброўак, ні жаніха, застаецца шмат часу на мары.

— Дэйсі, ты зноў сядзіш дома, — бурчыць бабуля. — Чаму не пайшла з сёстрамі на танцы? Чакаеш, што ў кавалераў прарэжацца трэцяе вока і яны ўбачаць цябе скрозь сцены?

Бабуля старамодная. Маладых людзей заве «кавалеры» і дзівіцца, што Эма ды Аліса не бяруць з сабой нататнічак і аловак, каб запісваць, каму абяцалі кадрылю. А цяпер жа ўсё прасцей. Дзяўчыны пакорліва стаяць і чакаюць, хто іх запросіць. І іх запрашаюць. Амаль усіх. Акрамя мяне. Я ж невідзімка. Не, скрозь мяне не прасвечваюць шпалеры: наадварот, гэта я зліваюся з імі. Ведаеце выраз «wall flower» — «насценная кветачка»? Так завуць дзяўчын на балі, незаўважных настолькі, што ўвесь вечар яны праводзяць ля сценкі. Прастаяўшы так раз і другі, я палічыла за лепшае заставацца дома — там хаця б можна прысесці.

Мае улюбёныя колеры — лавандавы і экру. Але ў цёткі Аўгусты свая тэорыя. «Яркай знешнасці — спакойныя ўборы, — кажа яна, — сціплай знешнасці — эфектную абгортку». У перакладзе на чалавечую мову гэта азначае, што страхоццю накшталт мяне варта апранацца ярка, каб мінакі яшчэ здалёк, за тры кварталы маглі заўважыць гэткую агіднасць і своечасова звярнуць з дарогі. Кожны раз, калі мы адпраўляемся ў краму гатовай вопраткі ці па тканіны, цётка купляе бледна-ружовае Алісе, палевае Эме, а мне дастаюцца фуксія ці аранж. Пэўна, цётка крыўдзіцца, што я не нашу ўсе гэтыя рэчы. Нічога, калі-небудзь яны зноў увойдуць у моду, і мае траюрадныя пляменніцы вельмі ім узрадуюцца. «Наша бабуля Дэйсі ў маладосці была заўзятай модніцай», — падумаюць яны, і я не стану іх пераконваць у адваротным.

Наогул цётку Аўгусту варта было б зваць мамай, але я не магу: я была ўжо занадта дарослая, калі бацька прывёў яе ў дом. Мне было пяць гадоў, калі я раскідвала пялёсткі руж на іх вяселлі. Не падумайце, мяне ніхто не крыўдзіць і падчаркай не называе: у цёткі Аўгусты цудоўны характар, і мае малодшыя сёстры таксама лёгкага нораву, дружалюбныя і гаваркія, вось-вось выпырхнуць замуж. Яны пайшлі ў маці — цёмнавалосыя, смуглыя, высокія. А я — бледная, рудаватая, праставатая. Адразу відаць, што я іншай пароды.

— З цыбуліны не вырасце ружа, — кажа пра мяне бабуля. А ўжо ў ружах бабуля разбіраецца, яна заўзятая садоўніца і агародніца. Наша бручка нават перамагла аднойчы на сельскагаспадарчай выставе акругі. Я не крыўджуся на бабуліны словы: якая там з мяне ружа! Калі казаць шчыра, такіх, як я, бяруць за лядашчую шыйку і выдзіраюць прэч з градкі, каб не псавалі выгляд.

— Мне шкада Дэйсі, цяжка будзе знайсці ёй мужа, — сказала неяк цётка Аўгуста, папіваючы з сяброўкай пасляабедзенную гарбату ў садовай альтанцы.

— Так, не пазайздросціш небарацы, з-за гэтага рабаціння яна падобная тварам да аржанога блінчыка. Здобнага румянага блінчыка, — адказала чуллівая сяброўка.

Яны не ведалі, што «блінчык» палівае кветкі непадалёк і ўсё чуе. Здаецца, у той дзень я ўпершыню расплакалася з-за сваёй знешнасці. Раней я разважала проста: калі маме, на якую я, пэўна, падобная, пашчасціла знайсці сабе мужа, майго добрага і прыстойнага бацьку, то і я змагу сустрэць добрага чалавека, калі прыйдзе час. Але пасля той падслуханай гутаркі мая вера пацьмянела. Аказваецца, я непрыгожая. Калі мяне і заўважаюць, то я здольная абудзіць толькі жаль. Я стала радзей глядзець у люстэрка і часцей задумвацца. Цяпер, калі мне мінула трыццаць, я не задумваюся наогул. Проста жыву, ды і ўсё. Аржаны блінчык ці цыбуліна — ну дык што, не ўсім жа быць ружамі. Роля ўсеагульнай цётачкі-векавухі не такая ўжо і дрэнная. Буду вязаць шкарпэткі пляменнікам і збіраць іх усіх на Каляды ў сваім вялікім і пустым доме. А можа, гэты дом застанецца Алісе ці Эме, калі іх жаніхі акажуцца недастаткова багатымі, і тады я стану нахлебніцай на старасці гадоў. «Слівавы пудынг сёння атрымаўся выдатны», — скажу я за абедам, і ўсё здзіўлена павернуцца ў мой бок: «Ой, а хто гэта тут?».

Не думайце, я не жалюся на жыццё. Я з радасцю сустракаю кожны новы дзень, а калі і злоўжываю часам разважаннямі, то выключна праз шкоднасць і начытанасць, а не ад журбы. Ад журбы, на шчасце, ніхто ў нашай сям'і не пакутуе. Ды і навошта пакутаваць, калі ва ўсіх ёсць справы куды цікавейшыя. Я абвязваю і абшываю ўсю сям'ю, бабуля садоўнічае, цётка Аўгуста кухарыць, і Эма ёй дапамагае, а самая наша малюпаценькая, Аліса, занятая больш за ўсіх: цэлымі днямі, з раніцы да позняй ночы, яна шукае сябе ў мастацтве. То пляце кошыкі з лазы, то піша санеты, то лепіць збаны, а апошнім часам сур'ёзна захапілася маляваннем на шоўку. Сям'я назірае за яе творчымі пошукамі замілавана і паблажліва. Так звычайна дарослыя глядзяць на малое, якое лепіць бабкі з пяску: маўляў, няхай сабе цешыцца дзіцятка.

Я лічу, кожная сям'я можа сабе дазволіць мець на ўтрыманні адну творчую асобу. Двое, трое — гэта ўжо перабор, а адна — у самы раз. Тым больш што ўсе займальныя справы — мыць, шыць, гатаваць ежу, выціраць пыл — мы разабралі сабе. Што ж заставалася рабіць небарацы Алісе, як не ўехаць па вушы ў мастацтва? Яна ўсё яшчэ не знайшла ў ім сябе, але і мастацтва яшчэ далёка не скончылася, таму ў хуткай будучыні, падазраю, нас чакаюць гукі флейты ці грук разца па камені, а можа быць, балет. Вядома, усё можа павярнуцца значна лепш, калі Аліса такі прыме прапанову каго-небудзь са сваіх шматлікіх паклоннікаў і выйдзе замуж. Цётка Аўгуста спадзяецца на гэта ўсёй душой. Калі ў Алісы быў перыяд захаплення опернымі спевамі, цётка ледзь утрымалася ад звароту да паслуг свацці. Але, на шчасце, Аліса хутка пераключылася на складанне філасофскага трактата пра сутнасць быцця, а гэты занятак, як вядома, патрабуе цішыні.

Бацька... Ледзь не забылася расказаць пра яго. Бацька таксама жыве з намі, але лічыць за лепшае рабіць выгляд, што яго тут няма. Адзіны мужчына ў доме, поўным жанчынамі, ён бліскуча выконвае свае мужчынскія абавязкі: чытае газету за сняданкам, курыць люльку на верандзе пасля вячэры, разразае гусака за святочным сталом. Яго цёплае паліто вывешваюць улетку на сонейка праветрыцца, яго шкарпэткі цыруюць з асаблівым стараннем, яго клапатліва ўкрываюць пледам, калі ён кладзецца адпачыць пасля абеду. Не ўпэўнена, што цётка чуе ад яго што-небудзь, акрамя «добрай раніцы», «дзякуй» і «дабранач», але гэта іх асабістая справа. Ды і не тое каб цётка Аўгуста нудзілася па гутарках, маючы ў наяўнасці бойкую на язык свякруху, дзвюх вельмі гаманкіх дочак і адну маўклівую, але ўсё ж здатную да маўлення падчарку. Часам жа прыемна і памаўчаць.